ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
1
ВЕРАСНЯ
ПАНЯДЗЕЛАК
№ 23 (1287)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## У добры шлях, першакурснікі!

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ! Прайшло ўсяго некалькі дзён, як закончыліся конкурсныя ўступныя экзамены. Вы з гонарам іх вытрымалі і заваявалі права называцца студэнтамі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Дазвольце павіншаваць вас, дарагія таварышы, з высокім званнем савецкага студэнта і пажадаць вам вялікіх поспехаў у вучобе на карысць нашай любімай Радзімы.

Вы папоўнілі універсітэцкую сям'ю напярэдадні вялікага юбілею. У 1981 годзе наш калектыў сустрэне сваё шасцідзесяцігоддзе. БДУ імя У. І. Леніна — плён працы ўсёй рэспублікі. Ён трывала звязаны з народам і абслугоўвае яго інтарэсы. За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў звыш 55 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі, навукі, культуры. Вам, сённяшнім першакурснікам, прадаўжаць і памнажаць слаўныя традыцыі выхаванцаў флагмана вышэйшай школы Беларусі.

Да свайго 60-годдзя універсітэт ідзе поўны сілы, энергіі, умудроны вопытам, гатовы рашаць адказныя і велічныя задачы, якія пастаўлены ў пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў», дакладзе кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі таварыша П. М. Машэрава на сходзе партыйнага актыву БДУ ў чэрвені гэтага года. Мы ўпэўнены, што гэтыя задачы па плячы буйнейшаму вучэбнаму і навуковаму цэнтру Беларусі, у якім зараз займаецца каля 18 тысяч студэнтаў, на 105 кафедрах працуе каля 1500 выкладчыкаў. Сярод іх 6 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, каля 100 прафесараў, дактароў навук, больш як 700 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

Вялікія заслугі нашага універсітэта ў развіцці навукі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. Яны высока адзначаны Камуністычнай партыяй і Савецкім урадам. У студзені 1949 года універсітэту прысвоена імя Уладзіміра Ільіча Леніна. У 1967 годзе універсітэт узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1979 год універсітэт узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.

Быць студэнтам такой цудоўнай вышэйшай навучальнай установы, якой з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, — вялікі гонар. Разам з тым гэта і да многага абавязвае. Выдатная вучоба — гэта найпершы абавязак кожнага студэнта.

У сучасных умовах, калі аб'ём неабходных для чалавека ведаў рэзка і хутка расце і яны з часам старэюць, кожны студэнт за час вучобы ва універсітэце павінен набыць уменне і навыкі самастойна папаўняць свае веды, арыентавацца ў хуткім патоку навуковай і палітычнай інфармацыі. І гэта ўменне трэба пачынаць набываць з першых дзён вучобы.

Акрамя ведаў па выбранай спецыяльнасці, кожны студэнт павінен у перыяд вучобы ва універсітэце набыць навыкі кіраўніка-арганізатара вытворчасці, навыкі прапагандыста, выхавацеля. Для гэтага ва універсітэце створаны ўсе ўмовы. У нас ёсць факультэт грамадскіх прафесій, на якім студэнты займаюцца пасля заняткаў. Факультэт рыхтуе лектараў, прапагандыстаў, арганізатараў культурна-масавай работы. Ва універсітэце ёсць цудоўныя творчыя калектывы — народны аркестр народных інструментаў, народны тэатр, танцавальны ансамбль «Крыжачок», харавая капэла.

Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола і прафком ўпэўнены, што вы, дарагія таварышы, прымеце самы актыўны ўдзел у грамадскай рабоце, набудзеце навыкі, якія вельмі неабходны для работы ў калектыве, у якім давядзецца вам працаваць пасля заканчэння універсітэта.

У нас ёсць усе падставы чакаць, што вы, першакурснікі, сваёй напружанай, мэтанакіраванай працай з першага ж дня заняткаў заслужыце павагу і аўтарытэт усяго калектыву універсітэта, паспяховай вучобай і актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю сустрэнеце XXVI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

У добры шлях, дарагія студэнты-першакурснікі! Поспехаў вам у вучобе і жыцці!

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**



НЕМНОГОСЛОВЬЕ ШКОЛЬНЫХ
АТТЕСТАТОВ —
ПОКА НЕСЛОЖНЫЙ
ЖИЗНЕННЫЙ БАГАЖ,
НО КАЖДОГО СТУДЕНЧЕСКОЕ
БРАТСТВО
УЖЕ ЗОВЕТ ЧУДЕСНЫМ СЛОВОМ
«НАШ!»

МЫ—ПЕРВЫЙ КУРС ЛЮБОГО
ФАКУЛЬТЕТА.
МЫ—СИМВОЛ ВСЕХ
НЕПРОЙДЕННЫХ ДОРОГ.
НАМ—НАЧИНАТЬ СНАЧАЛА.
А ВЕДЬ ЭТО
ТАК СЛОЖНО, ТАК
ОТВЕТСТВЕННО, ТАК МНОГО...

## ДАЛЕЙШЫХ ПОСПЕХАЎ!

Дацэнт кафедры філасофіі інстытута павышэння кваліфікацыі пры БДУ імя У. І. Леніна Міхаіл Якаўлевіч Ленсу паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара філасофскіх навук. Тэма дысертацыі — «Метадалагічныя праблемы навуковага атэізму і атэістычнага выхавання».

Шчыра віншуем М. Я. Ленсу з гэтай падзеяй і жадаем далейшых поспехаў.

● БАМ

# Слаўныя традыцыі

ПРЫ ЎЕЗДЗЕ ў Сярэбраны Бор стаіць скала, на якой высечана назва пасёлка. Студэнты з будатрада «Спадчына» таксама сваё месцазнаходжанне абазначылі вялікім, дэкаратыўна выпісаным словам «Спадчына».

Цёплая сустрэча была ў мяне з землякамі. Лепшы на механіка - матэматычным факультэце Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, багаты слаўнымі традыцыямі атрад пакінуў добры след на Пскоўшчыне і ў Карэліі. А сёлета яго байцы працавалі на БАМе.

Калі на мехмаце фарміраваўся атрад «Спадчына», камандзірам быў назначаны Ігар Юрэвіч. Кіраваў ён умела. Да яго хінуліся людзі, яму давяралі. Умее ён арганізаваць працу і адпачынак байцоў атрада, запаліць іх, правільна сарыентаваць у любой справе. У калектыве здаровы мікраклімат, тут не пачуеш размоў аб заробленых грошах, тут няма абгавораў і іншых адмоўных з'яў, якія дэзарганізуюць і разлучаюць людзей.

Навічкі ў атрадзе раўняюцца на тых, хто ўдзельнічае ў працоўным семестры не першы год. А такіх нямала: 25 байцоў «Спадчыны» ўжо чацвёрты раз выязджаюць у саставе СБА разам.

Мне давялося пазнаёміцца і з іншымі камандзірамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Напрыклад, з А. Грыгор'евым з атрада «Атланты» Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Чалавек сапраўды хвалюецца за даручаную справу, прыкладае вялікія намаганні, але не ўсё атрымліваецца. Магчыма, малавата вопыту (А. Грыгор'еў толькі адзін раз працаваў у атрадзе), магчыма, няма ў яго той камандзірскай іскрынкі, але факт застаецца фактам. Вось тут на дапамогу і прыходзіць вопытны камандзір І. Юрэвіч. Па-таварыску дапамагае ён Аляксандру, дае парады. Гэта таксама важная рыса камандзіра—думаць аб дабрабыце не толькі свайго атрада.

— З вашым прыездам жыць у пасёлку становіцца весялей, — сказаў аднойчы І. Юрэвічу сакратар камсамольскай арганізацыі А. Найманаў. І гэта сапраўды так. Пры актыўным удзеле мясцовых камсамольцаў студэнты зрабілі шмат. Скажам, стварылі дыскатэку.

Песня «Спадчына» гучыць як музычнае запрашэнне. Жыхары Сярэбранага Бору ведаюць, што гэтай мелодыяй студэнты з мехмата БДУ запрашаюць на сустрэчу з музыкай — беларускай, савецкай, замежнай. Ведаюць, што прыемныя сустрэчы чакаюць і аматараў эстрады, і класічнай музыкі. І ніколі не расчароўваюцца.

— Да новых сустрэч, — гаворыць, завяршаючы праграму, вядучы дыскатэкі Міхаіл Гарашчук.

Дагавор, які быў заключаны паміж атрадам і СМУ-1, выкананы паспяхова. СБА «Спадчына» — адзін з беларускіх атрадаў, каго па праву можна назваць лідэрам у сацыялістычным спаборніцтве.

Як я ўжо казаў, у атрадзе рабяты бывалыя, іх будатрадаўскі стаж — 3 —4 гады. Такім па плячы любая справа. І выконваюць яны яе творча, ініцыятыўна. Вось, напрыклад, давялося брыгадзе Віктара Вішнеўскага бетанаваць падлогі ў падвальным памяшканні. Аднесліся б рабяты бяздумна — і цягалі б бетон насілкамі. Але, падумаўшы як трэба, вырашылі, што аблегчыць гэту працу можна, калі пабудаваць латкі і пусціць бетон праз акно. Так і зрабілі. Сэканомілі шмат часу. І гэта не адзіны выпадак рацыяналізацыі працы.

Не забываліся студэнты з БДУ і аб грамадска - палітычнай рабоце. Вось так жылі, працавалі, шчодра аддавалі жар сваіх сэрцаў будаўнікам буйнейшай магістралі стагоддзя беларускія студэнты — байцы СБА «Спадчына».

**Л. НОВІКАЎ,**
**наш кар.**

● РАДКІ З ПІСЬМА

# СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ

МНЕ ДАВЯЛОСЯ 12 ліпеня вечарам быць у вёсцы Васільеўская Пушкінагорскага раёна, дзе я ў 1944 годзе ваяваў. У гэтай вёсцы ў клубе быў арганізаваны вечар-адпачынак, і на сцэне выступалі байцы студэнцкага будаўнічага атрада «Рамантык» механіка - матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

Рабяты стараліся, каб вечар прайшоў цікава, а выступленні былі змястоўнымі і карыснымі. Прысутным гэта вельмі спадабалася.

Ад сябе і працаўнікоў калгаса «Ленінскі шлях» выражаю шчырую падзяку членам студэнцкага будаўнічага атрада «Рамантык» за добра праведзены вечар і запрашаем да нас на наступнае лета. Вялікіх вам поспехаў у вучобе!

**С. МАЗІНЧАНКА,**
**ветэран вайны і працы.**

# НА «ВЫДАТНА»

### ЗДАЛІ ЭКЗАМЕН ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА БАЙЦЫ 90 СБА УНІВЕРСІТЭТА

**Трэці семестр фінішаваў. З максімальнай аддачай выкарыстоўвалі кожную рабочую хвіліну байцы СБА універсітэта і дасягнулі значных поспехаў у выкананні сацыялістычных абавязацельстваў.**

**Ударная праца на аб'ектах народнай гаспадаркі, шэфская дапамога працаўнікам вёскі, шматгранная грамадска-палітычная дзейнасць студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна — дастойны падарунак XXVI з'езду КПСС.**

**НА ЗДЫМКАХ:** на мітынгу, прысвечаным заканчэнню працоўнага семестра, выступае камандзір Слабадзейскага занальнага атрада В. А. Прокашава; да пабачэння, сонечная Малдавія.

Фота **А. Мунцяна.**





# Салдацкі ліст

АПЕРАЦЫЯ «ПАМЯЦЬ»

**«Дык вось, дарагія цёця і сястра Віта, мяркую, што сустрэнемся. Ужо засталося ваяваць нядоўга, таму што 42-гі год — рашаючы: хто каго. Але ўпэўнены, што немцаў мы выганім са сваёй зямлі і вернемся з перамогай, цэлыя і здаровыя, дадому.... Толькі вось не ведаю, ці ёсць дом і бацькі...»**

У перапынку паміж баямі пісаў салдат ліст. У акопе хлюпала восеньская гразь, было няўтульна на гэтай стылай зямлі. А ён пісаў ліст. Пасля карабіна пальцы не хацелі трымаць абгрызены хімічны аловак. Ён пісаў дадому. Перад вачыма стаяў адзін і той жа родны пейзаж: высокі бераг павольнай ракі з высокімі-высокімі соснамі.

Жоўты, надарваны на згібах ліст перажыў свайго гаспадара. Сяржант Ігнат Крыўмень загінуў у баі пад Варонежам. Мы не ведаем, як ён загінуў: ці забіты напавал куляю, ці асеплены ўспышкай снарада, які разарваўся ў трох кроках ад яго. А можа ён паміраў на аперацыйным стале, стрымліваючы свой боль тым, што гэты бой, гэты год — рашаючыя.

А ліст узяў у сваё нутро безабаронны паштовы самалёцік. Ён ляцеў, рызыкуючы стаць ахвярай паветранага пірата, яго лавілі ў перакрыжаванні зенітных пражэктараў. Салдата не стала, а салдацкі ліст захаваўся — вось ён, ляжыць на стале, можна беражліва ўзяць яго ў рукі і прачытаць яшчэ і яшчэ:

**«Добры дзень, дарагія цёця і сястра Віта. Дасылаю вам сваё прывітанне і паведамленне, што я жывы і здаровы, чаго і вам жадаю».**

...Алена Юлбарысава і Таня Марозава, урач і баец СБА «Зарніцы» БДУ імя У. І. Леніна, вярталіся ў лагер пасля чарговай сустрэчы з ветэранамі вайны. Трэба сказаць, што атрад з першых дзён працы ўключыўся ў аперацыю «Памяць». Сшытак паступова запаўняўся ўспамінамі, блішчалі на сонцы свежапафарбаваныя помнікі... І, відаць, павагай акружыўшы ветэранаў, хлопцы і дзяўчаты карыстаюцца заслужаным давер'ем усёй вёскі Сар'я. Да дзяўчат падышоў немалады чалавек Віктар Уладзіміравіч Крыўмень і папрасіў:

— Знайдзіце майго брата. Хоць магілу яго адшукайце, — і падаў салдацкія лісты. — Гэта ўсё, што ад яго засталося.

...Тры салдацкія трохвугольнікі. Адзін са шпіталя ў сібірскім горадзе, два другія — з дзеючай арміі з нумарам палявой пошты.

У той вечар лісты прачытаў кожны баец атрада. Паперы бралі ў рукі беражліва. Было вырашана — шукаць!

...Няроўныя радкі быццам адступаюць на другі план — і бачыш ваенныя будні, асветленыя полымем вогнішчаў, пункцірамі трасіруючых куль, чуеш працяглае выццё снарадаў, свіст ветру ў апаленых галінках дрэва.

12 лістапада 1941 года Ігнат Крыўмень быў ранены. У лісце са шпіталя, каб родныя не хваляваліся, ён піша: рана лёгкая, у нагу, хутка папраўлюся.

І зноў дзеючая армія. Вораг рвецца да Волгі, Сталінграда, Шляхі да яго абараняе Ігнат Крыўмень. Гэта тады, летам 1942 года, Нарком абароны аддае загад: «Ні кроку назад!» З ліста даведваемся, што І. Крыўмень стаў сяржантам.

**«Я прызначаны камандзірам аддзялення, таму зараз прыходзіцца не толькі за сабой, але і за байцамі глядзець больш».**

А потым быў бой, пасля якога лісты пачалі адлік свайго самастойнага жыцця. Яны зберaглі след ягонай думкі, ягонай рукі, зберaглі яго клопат, яго сум... Над гэтымі лістамі праліта нямала слёз, а радасныя звесткі прымаліся цеплынёю ўсмешак. Лісты асцярожна захоўвалі ў шкатулках разам з бабулінымі караламі і фотаздымкамі, на якіх дзедаў вус па-заліхвацку закручваўся бадзёрым кольцам. Іх захоўвалі як памяць аб сыне, браце, пляменніку...

— Мы ведаем аб Вялікай Айчыннай толькі з кніг, кінафільмаў, — гаворыць А. Юлбарысава. — А лісты гэтыя можна ставіць у адзін рад з ваеннай хронікай, прастрэленым камсамольскім білетам, голасам Левітана, запісаным на стужку. Гэта дакументы, рэліквіі.

— Спачатку для нас гэта было чымсьці накшталт рэдкага антыкварыята, — дадае камандзір «Зарніц» В. Бурганскі. — А зараз усе зразумелі: чалавек, які перадаў нам лісты брата, спадзяецца, што мы дапаможам яму, знойдзем месца, дзе загінуў І. Крымень. Адказна, што і казаць.

Студэнты поўныя рашучасці працягваць пошук. Яны сустрэліся з сястрой Вітай — Вікторыяй Уладзіміраўнай Нікіцінай, даведаліся, што быў у яе брата франтавы таварыш, знайшлі адрас, па якому гэты таварыш жыў у 1946 годзе...

Групе «Пошук» універсітэта будзе чым заняцца ў новым навучальным годзе. І хочацца верыць, што праца гэта завершыцца паспяхова. Бо кожны з загінуўшых стаў часткай таго, што мы сёння называем масавым гераізмам. Любыя звесткі аб гэтых людзях павінны быць руплівa сабраны. Гэта — матэрыял, з якога адліваецца нерукатворны абеліск — у памяці сённяшніх і будучых пакаленняў!

Жоўты, надарваны на згібах ліст... Гэта якраз тое, напісанае, што павінна застацца назаўсёды.

**А. ГАНЧАРОЎ.**

● МАЛДАВІЯ

# Гонар за зробленае

СВОЙ ТРЭЦІ семестр атрад «Гадограф» механіка - матэматычнага факультэта правёў у Малдавіі. Нас сустрэла шчодрае паўднёвае сонца, гасцінныя жыхары вёскі Уладзіміраўкі, кіраўніцтва калгаса імя Жданава. Атрад прыязджае сюды ўжо трэці год, таму мы лічым сябе старажыламі.

З кожным днём мы пераконваліся ў тым, што чым больш праяўляеш энтузіязму, весялосці, умення ўнесці ў кожную справу свой малады запал — тым цікавейшым і паўнейшым становіцца жыццё. І не выпадкова, што дзённыя заданні мы пастаянна выконвалі на 160—170 працэнтаў.

На рахунку атрада нямала карысных спраў. Наша агітбрыгада выступала з цікавымі канцэртнымі праграмамі перад механізатарамі і паляводамі.

Непрыкметна праляцела лета, праляцелі дні нашай агульнай працы, вясёлага будатрадаўскага жыцця. Але надоўга застанецца добры след працавітых рук на малдаўскай зямлі, застануцца ў сэрцах гонар за зробленае, радасць і цеплыня сяброўскіх сустрэч.

**А. ЯКУБОЎСКАЯ,**
**баец СБА «Гадограф».**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 верасня 1980 г.

АТ 15337 Заказ № 1236.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ